Бацькаўшчына

WHITERUTHENIAN WEEKLY „THE FATHERLAND“ Цана 50 н. фэн.

№ 23 (26) 4 ліпеня 1948 г. год выданьня 2

УСЮДЫ ВОЙСТРЫ КРЫЗІС

І ЗА «ЗЯЛЕЗНАЙ»

ТЫТО АДЛУЧАНЫ АД МАСКВЫ

Прага (ДЭНА-Рэйтар). Камінформ апублікаваў камунікат, якім у канцавым выніку «адлучаецца» прэм'ер Югаславіі маршал Тыто, а верным сябром югаслаўскае камуністычнае партыі раіцца зьмяніць сваіх правадыроў, калі апошнія ня будуць у стане зьмяніць сваю палітыку.

Югаслаўскім камуністым пад правадырствам марш. Тыто закідаецца, што яны раўналі палітыку СССР да «мерапрыемстваў імпэрыялістычных дзяржаваў», моўчкі прыймалі тэорыю, што «капіталістыя» становяць меншую небясьпеку для югаслаўскае незалежнасьці, як СССР, вялі прапаганду супраць СССР, спрабавалі выклікаць недавер да чырвонае арміі. У Югаславіі блага абходзіліся з савецкімі вайсковымі спэцыялістымі, савецкіх цывільных спэцыялістых ставілі пад кантроль паліцыі бясьпекі, такія-ж мэтады ўжываліся да белградзкіх прадстаўнікоў савецкае камуністычнае партыі й нат да пэўнага ліку савецкіх афіцыйных прадстаўнікоў. Камінформ згаджаецца з пастановаю ЦК савецкае камуністычнае партыі, што зазначае пра хібную палітыку ЦК камуністычнае партыі Югаславіі «і асабліва таварышоў Тыто, Кардэля (першы заступнік Тыто), Дыляса (міністар без партфэля) й Ранковіча (міністар нутраных справаў)». Ім усім закідаецца «контррэвалюцыйны трацкізм», «нацыяналізм», «рэвізія марксызму-ленінізму», «схаваньне камун. партыі за народным фронтам», «дыктатура» над ёю, «ухіляньне ад выбараў», ад «крытыкі й самакрытыкі», нарэшце — адмова ўзяць удзел у вапошнім паседжаньні камінформу. ЦК югаслаўскае кампартыі і ўся партыя абвяшчаецца «вонках сям'і братніх кампартыяў, задзіночанага камуністычнага фронту й камінформу».

ЯК БОМБА...

Бад Наўгайм (ДЭНА). Паведамленьне пра «праклятцыцё» кампартыі Югаславіі й ейнага кіраўніцтва камінформам выклікала ў цэлым сьвеце ажыўленую ўвагу. У самой югаслаўскай сталіцы паведамленьне камінформу выбухнула, як бомба. Афіцыйнага заняцьця становішча зь Белграду яшчэ няма.

Кіраўнічыя амэрыканскія дыплёматы ў Вашынгтоне уважаюць за ясныя прынамся два пункты: 1) камуністычнае «найвышэйшае камандаваньне» мае дачыненьне зь першым вялікім разломам у ўсходня-эўрапейскім блёку сатэлітаў, 2) «найвышэйшае камандаваньне» спачатку абмеркавала, а пасьля засудзіла правадыроў кампартыі Югаславіі, бо гэткі мэтад гадамі ўжываецца камуністымі ў СССР і вонках.

Дырэктар інфармацыйнага агенцтва ІНС на Эўропу ў Парыжы разглядае справу, як найзначнейшую й найдалёкасяжнейшую падзею ад часу канца другое ўсясьветнае вайны.

У Трыесьце апублікаваньне камунікату камінформу, паводля АФП, выклікала сярод жыхарства яшчэ глыбейшае ўражаньне, як вестка аб сьпінуцьці Мусаліні ў 1943 г.

У лёнданскіх дыплёматычных колах выказваецца пагляд, што Масква выключэньнем югаслаўскае кампартыі з камінформу заклікае Югаславаў да бунту супраць іхнага правадырства. Але прабег такой акцыі вельмі няпэўны, бо якраз 4 засуджаныя сябры ўраду — найпапулярнейшыя людзі Югаславіі. Маршал Тыто — і прэм'ер і міністар абароны — можа лічыць на поўную вернасьць арміі. Навет сярод югаслаўскіх некамуністых маршал Тыто, наўсуперак сваму дыктатарству, набыў пэўную папулярнасьць. Пасьля ягонага «праклятцыя» гэтая папулярнасьць цяпер, праўдападобна, магутна ўзрасьце.

САВЕЦКАЯ БЛЁКАДА

БЭРЛІНСКІЯ ПАДЗЕІ

Бэрлін (паводля **ДЭНА**). Шэф савецкай вайсковай адміністрацыі, маршал Сакалоўскі, у пададзенай праз бэрлінскае радыё адозьве да жыхарства заявіў, што саюзная камандантура ў Бэрліне практычна спыніла існаваць, як орган кіраўніцтва гораду. Саветы, выключыўшы падачу току ў заходнія сэктары Бэрліну, цяпер загадалі спыніць усе харчовыя транспарты ў Бэрлін. Разам з поўным спыненьнем міжзонната руху, гэта азначае татальную блёкаду заходніх сэктараў Бэрліну. Паводля заявы амэрыканскага каманданта гораду, харчовага запасу стане на 2-4 тыдні. Брытанцы й Амэрыканцы спрабуюць усе спосабы для забясьпечаньня гораду паветраным шляхом. Ужо прыбылі дзеля гэтага з ЗША і працуюць 39 транспартавых самалётаў, атрымалі загад прыбыць 100 брытанскіх самалётаў. Магчымае пасланьне трыма заходнімі аліянтамі агульнае ноты ў Маскву ў справе савецкае блёкады Бэрліну. Брытанскі губэрнатар на Нямеччыну ген. Робэртсон зьвярнуўся пісьмова да марш. Сакалоўскага, выступаючы за безадкладнае аднаўленьне нармальнага руху між Бэрлінам і заходнімі зонамі. Пры праезьдзе праз амэрыканскі сэктар Бэрліну марш. Сакалоўскі быў затрыманы амэрыканскай паліцыяй за парушэньне найвышэйшае хутчыні язды й пратрыманы 31 часіну. Ген. Клей прынёс выбачэньне перад Сакалоўскім у гэтым выпадку. Бэрлінскі магістрат разважае справу аб звароце да Задзіноч. Нацыяў. Узводля запярочаных вестак, аб гэткім звароце да ЗН меў прасіць данскага міністра замежных справаў ген. Робэртсон у часе сваіх кагадзешніх наведзінаў Капэнгагену. Саветы забаранілі прывоз мэдыкамэнтаў у заходнія сэктары. Як у вадплату, заходнія ўлады спынілі забясьпечаньне ўсходняга сэктару інсулінам і пэніцылінам.

ГАЛАСЫ ПРА БЭРЛІН

Бэрлін (паводля **ДЭНА**). Кіраўнічыя асобы амэрыканскага вайсковага кіраўніцтва Нямеччыны характарызуюць сучаснае разьвіцьцё ў Бэрліне, як «найцяжэйшы крызіс, які толькі быў у якім-небудзь пункце сьвету між ЗША, заходнімі аліянтамі й СССР ад часу канца вайны».

Чэрчыль на сходзе кансэрватыўнае партыі заявіў, што падзеі ў Бэрліне якраз такія цяжказважкія, як у часе Мюнхенскага крызісу.

Амэрыканскія газэты ў бальшыні падхапляюць гэты пагляд Чэрчыля й згаджаюцца зь ім. «Нью Ёрк Таймс» пры гэтым уважае, што ў заходніх дзяржаваў ёсьць 3 магчымасьці: 1) супакоіць саветы адыходам з Бэрліну, 2) узяць пад развагу вайсковыя прапановы да разьвязаньня справы Нямеччыны і 3) адплаціць СССР роўным за роўнае. Да апошняга належыць энэргічны пратэст і дэмарш перад ЗН. Газэта «Вашынгтон Пост» піша, што палажэньне ў Бэрліне ўсё-ж іншае, чым было ў Мюнхэне. Былая нямецкая сталіца ўсяго сядзіба цэнтральнага кіраўніцтва акупаванае Нямеччыны, якога больш ня існуе. Няма лёгікі, пасьля пастановы стварыць заходня-нямецкі ўрад у Франкфурце, трымаць яшчэ фарпосты ў Бэрліне, якія ня будуць мець больш ніякіх заданьняў.

Уплывовая ангельская газэта «Обсэрвэр» выказвае на за тое, каб у дыплёматычным змаганьні за нямецкую сталіцу кінуць на шалі вагаў веданьне заходнімі дзяржавамі атомнае зброі. Газэта зазначае, што прыпушчальна ў межах наступных трох год СССР зробіць собскую атомную зброю. Калі гэты час прыйдзе, ня будзе больш ніякае магчымасьці выкарыстаць перавагу Захаду ў гэтым пункце.

ВЫЛУЧНЫ СТАН У АНГЕЛЬШЧЫНЕ

Лёндан (ДЭНА). На параду ўраду, ангельскі кароль выдаў праклямацыю аб вылучным стане, што дае ўраду паўнамоцтвы ўжываць мерапрыемствы, канечныя для ўтрыманьня харчовага забясьпечаньня брытанскага жыхарства.

Паводля афіцыйных дадзеных, у лёнданскіх доках бастуе 19 000 работнікаў. Безадказнае захаваньне пэўнае часткі работніцтва пагражае харчоваму забясьпечаньню брытанскага народу.

АПОШНІМ ЧАСАМ

* У Бэрлін прыбыў заступнік амэрыканскага міністра абароны, дзяржаўны падсэкратар міністэрства Уільям Дрэпэр.

* Маршал Тыто й іншыя кіраўнічыя камуністыя Югаславіі вядуць бязупынныя патаёмныя канфэрэнцыі на кватэры ў Тыто.

* Італія й Ірляндыя першымі з эўрапейскіх краёў падпісалі двубаковыя ўмовы з ЗША ў справе пляну Маршала.

* Прэзыдэнт Труман падпісаў законы: аб амэрыканскай замежнай памозе ў суме 6 030 710 228 даляраў, аб 21-месячнай абавязкавай вайсковай службе для мужчынаў 19-25 год і **аб прыняцьці 205 000 уцекачоў у ЗША.**

УВАГА!

Цана нашае газэты ў новай нямецкай валюце тымчасам устаноўленая на 50 фэнігаў за нумар. Цэны за межамі застаюцца старымі.

ПІЛЬНАЯ СПРАВА

Бадай усе нацыянальныя групы ДП, якія ў выніку мінулае вайны апынуліся за межамі сваіх краёў, цяпер вельмі актыўна, як на балонах свайго пэрыядычнага друку, а таксама і ў вадмысловых выданьнях шырака асьвятляюць гістарычныя падзеі ад сама старых часоў аж да нашых дзён, высьвятляюць і абмяркоўваюць праблемы гаспадарскае (эканамічнае) структуры гэтых краёў у мінулым і ў будучым ды даюць дэтальныя геаграфічныя нарысы аб іх.

Цяпер, калі мы маем свой пэрыядычны друк, мы павінны безадкладна пачаць тую самую працу. Гэтыя меркаваньні выклікаюцца цэлым сьцягам абставінаў. Нашая эміграцыя, а асабліва ейнае маладое пакаленьне, якое ўзгадоўвалася ў школах, што сваім духам ня былі нашымі нацыянальнымі, вельмі мала ведае як аб мінуўшчыне, а таксама й сучаснасьці нашае Бацькаўшчыны. Узяць хоць-бы тых, што гадаваліся пад уплывам савецкім (ці то ў Савецкай Беларусі, ці то ў Заходняй, пасьля акупацыі яе). Веда іхная абмяжоўвалася часамі гісторыі пасьляррэвалюцыйнага пэрыяду, тэрыторыяй г. зв. БССР, памінаючы карэнныя беларускія землі, што часова апынуліся за межамі Савецкай Беларусі (Віленшчына, Дзьвіншчына, Падляшша, Смаленшчына, Вялікалуччына, Браншчына й інш.). Зразумела, што беларуская інтэлігенцыя павінна ўзяць за свой абавязак высьвятліць у запраўдным гістарычным і сучасным разрэзах праўдзівы стан рэчаў, прышчапляючы ўсім, і моладзі першым чынам, любасьць да свайго Краю й Народу.

Спынімся больш канкрэтна над галоўнымі з нашых задачаў:

1. Нашая Бацькаўшчына на працягу свайго йснаваньня была ў розных абставінах, пачынаючы ад часу, калі яна, як Вялікае Княства Літоўскае, займала пануючае палажэньне ўва Ўсходняй Эўропе і канчаючы на паднявольных часох бальшавізму, калі аддзеленая на наругу, раскроеная й падзеленая, яка йснуе толькі намінальна, на паперы. Павінны быць падрабязна асьветленыя дзеяньні й чыны нашых вялікіх прашчураў Пр. Скарыны, Аўфр. Полацкай, Усяслава Чарадзея, вялікіх князёў Міндоўга, Ягайлы, Альгерда й іншых, змагароў за справу Беларусі, як Кастуся Каліноўскага, Грынявецкага, а таксама зацятае змаганьне нашага народу за сваю незалежнасьць нашымі часамі з праўдзівым асьвятленьнем ролі такіх асобаў (хаця яны й былі камуністымі), як Ігнатоўскі, Прышчэпаў, Чарвякоў, Галадзед, Шаранговіч і інш.

Не павінна застацца ў баку сучасная жорсткая русыфікацыя ня толькі тэрыторыяў, якія фармальна й фактычна належаць Расейскай «фэдэрацыі» (Смаленшчына, Браншчына, Вялікалуччына), а й самой г. зв. БССР, дзе фактычна беларускае літаратурнае мовы ня йснуе, а калі й ёсьць для паказу, дык гэтак папсутая, што проста нельга чытаць (прыкладам: «Мінская вобласць выпаўніла план хлебазагатовак да гадавіны Акцябра». Што гэта, мова ці шарж?), дзе на пасадах міністраў і кіраўніках іншых органаў няма бадай ніводнага Беларуса, а выключна імпартаваныя з Расеі або зь іншых краёў (Гусараў, Ігнацьеў, Цанава-грузін, Кісялёў, што «бароніць» нашыя інтарэсы на міжнароднай арэне, Казлоў, Панамарэнка, Мельнікаў і інш.). Таксама, як за царом, калі на Беларусі былі Мусіны-Пушкіны, Гірсы, Курловы й інш.

Ці ведае хто такі край у сьвеце, дзе-б прэзыдэнт і прэм'ер-міністар ня ведалі мовы гэтага краю? Гэта сьмешна, але нажаль якраз у Беларусі роўны прэзыдэнту Казлоў, прэм'ер Панамарэнка, міністар замежных справаў Кісялёў, міністар нутраных справаў Цанава — ня ведаюць беларускае мовы, бо яны не Беларусы.

2. За часы сваё гісторыі Беларусь перабывала ў сама разнастайных эканамічных абставінах. У нашым краі быў і фэўдальны лад за старымі часамі, перажыўшы ён і жудасныя часы царскага прыгону, быў пертвораны ў калёнію Расейскае Імпэрыі, быў падзелены паміж колькіх краёў (Расея, Польшча, Лацьвія), у якіх быў сама разнастайны эканамічны ўклад, перажывае цяпер час нячуванага ў сьвеце жудаснага экспэрымэнту ў выглядзе калгаснага ладу, які супярэчыць прыродзе нашага народу. Прыватная маемасьць і собская ініцыятыва ня йснуюць. На горкім дазнаньні гэтых прыкладаў наш абавязак у тым, каб выпрацаваць ужо тут такія формы эканамічнага ўкладу, якія адпавядалі-б нацыянальным асаблівасьцям нашага народу, з тым, каб будучыя пакаленьні не захапілі-б нас зьнячэўку. Гэта праца вельмі адказная й вымагае мабілізацыі ўсяе нашае грамадзкасьці.

3. Балоны нашага нацыянальнага друку павінны быць скарыстаныя для шырокага геаграфічнага апі-

саньня нашае Бацькаўшчыны, ейнае прыроды, жыхарства, звычаяў, культуры. Трэба разьвеяць думку, якую праводзяць нашыя варагі, што мы бедныя, цёмныя й ня здолеем існаваць, як самастойнае гаспадарства. Трэба расказваць, што ў нас ёсьць вялікія магчымасьці разьвіцьця малочнае жывёлагадоўлі й сьвінагадоўлі, чаму спрыяюць вялікая колькасьць лугоў і засеваў бульбы, што мы найбагацейшы лесам і лясным промыслам у Эўропе край, што на Палесьсі ў нас растуць такія каноплі, якіх яшчэ ня бачыў сьвет (прыкл. Любаньскі раён на Бабруйшчыне ўжо на працягу 10 год трымае сусьветны рэкорд што да ўраджаю канопляў). Калі адняць ад Расеі нашыя плошчы пад лёнам, які вельмі пашыраны на Полаччыне, Віцебшчыне, Магілеўшчыне, Вялікалуччыне й Смаленшчыне, дык ня толькі не паўстае пытаньне аб экспарце яго з Расеі, а наадварот, трэба будзе вывозіць лён зь Беларусі. Разьвіцьцё сьпірытусавай прамысловасьці змусіць Расею (жыхары якое вельмі ласыя на рэчы такога гатунку) плаціць нам вялікія грошы. А садаўніцтва й пчалярства, а торф і коксагыз, ды ці-ж можна ўсё пералічыць?

Нарэшце, трэба давесьці і гістарычна і этнаграфічна, што і Вільня і Беласток, і Смаленшчына зь Вялікалуччынай ды Браншчынай — гэта адвечныя нашыя землі, а калі й апыніліся цяпер за межамі г. зв. БССР, дык толькі не на сваё жаданьне, а з «добрае волі» нашых няпрошаных гаспадароў.

Як бачым, праца вялікая й адказная. Трэба зараз-жа рушыць яе. Абавязак нашых кіраўнікоў так разьмеркаваць сілы, каб усё было ахоплена й нічога не прапушчана.

В. Верасень.

ВАРШАЎСКАЯ КАМЭДЫЯ СКОНЧЫЛАСЯ

Варшава (ДЭНА-Рэйтар). У камунікаце, выданым па сканчэньні варшаўскае канфэрэнцыі міністраў замежных справаў васьмёх усходня-эўрапейскіх краёў, заходнія аліянты вінавацяцца ў парушэньні ўсіх умоваў пра Нямеччыну й як найвастрэй засуджаюцца рэкамэндацыі лёнданскае канфэрэнцыі шасьцёх дзяржаваў. У камунікаце ставіцца 5 вымаганьняў: 1) мерапрыёмствы для забясьпечаньня канчальнае дэмілітарызацыі Нямеччыны, 2) устанаўленьне пэўнага тэрміну для кантролю чатырох дзяржаваў над цяжкой прамысловасьцяй рурскае акругі й перашкоджаньне аднаўленьню нямецкага ваеннага патэнцыялу, 3) утварэньне часовага ўраду для цэлае Нямеччыны, 4) заключэньне мірнае ўмовы зь Нямеччынай у згодзе з патсдамскай умовай, 5) распрацаваньне мерапрыёмстваў, якія ўмагчымілі-б выкананьне Нямеччынай ейных рэпарацыйных павіннасьцяў супраць гаспадарстваў, што пацярпелі ад нямецкае агрэсіі.

АДНО ЗАМЫЛЕНЬНЕ ВАЧЭЙ

Варшава (ДЭНА-Рэйтар). Як тут мяркуюць, апублікаваныя пяць пунктаў дэкларацыі варшаўскае канфэрэнцыі толькі вуалююць запраўдны характар нарадаў. Весткі пра дэкларацыю аб стварэньні ўсходнянямецкага ўраду зь сядзібай у Ляйпцыгу выдаюцца перадчаснымі. Усё-ж даваронныя колы й далей трымаюцца пагляду, што гэты пункт стаяў на парадку дня на выдатным месцы. Дэлегацыі на канфэрэнцыю суправаджаліся высокімі афіцэрамі, і наагул дапушчаюць, што адначасна з палітычнай канфэрэнцыяй адбываліся й вайсковыя нарады.

КАРОТКІЯ ВЕСТКІ

* У Сярэдняй Японіі адбыўся цяжкі землятрус, які спрычыніў шмат шкодаў.

* Кангрэс падаў на подпіс прэзыдэнту Труману законапраект аб асыгнаваньні на абаронныя мерапрыёмствы ЗША 6 767 688 163 дал.

СПРАВЫ ДП

АМЭРЫКАНСКАЙ ЗОНЕ НАЙБОЛЬШАЯ ЎВАГА

Сп. Уільям Ток, выканальны сакратар ПК ІРО, пры сваіх цяперашніх наведзінах Амэрыканскае зоны Нямеччыны сказаў, што законапраект пра прыняцьцё 200 000 ДП на працягу наступных двух год у ЗША адчыняе перад ІРО найбольш усьцешныя, падбадзёрныя пэрспэктывы ад часу ейнага заснаваньня. Разам зь іншымі, ужо цьвёрда ўстаноўленымі й запрапанаванымі перасяленскімі акцыямі гэта дае надзею на разьвязаньне праблемы ДП да лета 1950 г.

Із сотняў тысячаў ДП, разьмешчаных у трох заходніх зонах Нямеччыны й Аўстрыі, а таксама ў Італіі, Францыі й ін. краёх, найбольшая частка жыве ў амэрыканскай зоне Нямеччыны. Адсюль вынікае, што ня толькі нельга зьмяншаць намаганьняў у кірунку эміграцыі ДП з гэтае зоны, але трэба яшчэ больш узмоцніць іх. Наведзіны сп. Токам Амэрыканскае зоны Нямеччыны і стаяць у сувязі з гэтым. «Мы ўважаем за канечнае для гэтае зоны, — сказаў сп. Ток, — пасылаць ува ўсе краі асяленьня ад 11 да 15 тыс. асобаў на месяц».

Тымчасам яшчэ няведама, якім парадкам мае праводзіцца перасяленьне ў ЗША. Дапушчаецца, што яно будзе праходзіць праз павялічаны штаб консуляту, або праз адборную камісію, ужо знаную ПК ІРО. Такія камісіі звычайна складаюцца з эміграцыйнага афіцэра, візавага афіцэра, лекара й спэцыялістага ад прафэсіяў.

Сп. Ток заявіў, што ІРО поўнасьцяй сьведамая велічы сваіх заданьняў і «падрыхтаваная пераняць тую адказнасьць, якая прадчуваецца й боязка чакаецца апошнімі месяцамі».

«Нацыі заходняе Эўропы й заходняе паўкулі ўзгадаваныя ў сямейным духу й сьведамыя таго, што сям'я становіць асноўны прынцып надзейнага грамадзяніна, — сказаў нарэшце сп. Ток. — Адсюль мая вялікая надзея, што заканадаўства ЗША як і іншыя праграмы перасяленьня ДП падчыркнуць як мага перасяленьне сямейных групаў».

Сэсія Рады БНР

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ БЕЛАРУСКАГА ПРЭСБЮРО

У дваццатых датах чырвеня месяца сёлета адбылася двудзённая сэсія Рады Беларускае Народнае Рэспублікі. На сэсіі былі разгледжаныя, як два асноўныя пытаньні парадку дня, справы вонкавае й нутраное беларускае палітыкі. Пастановы, прынятыя на сэсіі ў гэтых справах, пададзеныя да распараджаньня Беларускага Прэсбюро дзеля апублікаваньня, далучаюцца да гэтага паведамленьня.

БЕЛАРУСКАЕ ПРЭСБЮРО
Парыж-Лёндан

ПАСТАНОВА

Сэсіі Рады Беларускае Народнае Рэспублікі

У СПРАВЕ БЕЛАРУСКАЕ ВОНКАВАЕ ПАЛІТЫКІ

Разважыўшы сучаснае міжнароднае палажэньне й нацыянальна-вызвольныя патрэбы ды імкненьні беларускага народу, Сэсія Рады БНР пастанаўляе:

1. Вонкавая палітыка Ўраду БНР павінна абапірацца на гістарычнай традыцыі беларускае дзяржаўнасьці й адказваць сучасным і будучым патрэбам беларускага народу.

2. Усімі сіламі ймкнуцца да аднаўленьня беларускае дэмакратычнае дзяржавы, абвешчанай Радай Беларускай Народнай Рэспублікі гістарычным Актам 25 сакавіка 1918 г.

Гэтая беларуская незалежная дзяржава павінна абыймаць усе этнаграфічныя беларускія землі з улучэньнем у яе часткі Ўсходніх Прусаў зь Кенігсбэргам, што павінна быць справядлівай рэкампэнсатай за ўсе калёсальныя зьнішчэньні Беларусі й беларускага народу, спрычыненыя нямецкім гітлерызмам у часе другое сусьветнае вайны, і што дало-б магчымасьць доступу Беларусі да мора, канечнага для ейнага эканамічнага разьвіцьця. Гэтае дамаганьне абгрунтоўваецца яшчэ й тым, што на тэрыторыю часткі Ўсходніх Прусаў, прылучанай сяньня да РСФСР, прымусова перaселеная апошнімі гадамі савецкімі ўладамі вялікая колькасьць беларускага жыхарства з этнаграфічнае Беларусі.

Адначасна змагацца за зварот беларускага этнаграфічнага прастору, адрэзанага ад Беларусі на карысьць Польшчы лініяй Керзона на аснове Ялцінскае ўмовы.

3. Дамагацца дыплёматычнымі спосабамі поўнага прызнаньня іншымі народамі законнага права беларускага народу на дзяржаўную незалежнасьць у ягоных этнаграфічных межах і з доступам да мора, а таксама дзейнага падтрыманьня — на аснове ўзаемных забавязаньняў і супрацоўніцтва — беларускага народу ў здабыцьці й замацаваньні ягонае дзяржаўнае незалежнасьці.

4. Імкнуцца да поўнага зьнішчэньня бальшавізму й распадзелу расейскае імпэрыі на нацыянальныя гаспадарствы паняволеных ёю народаў, без чаго абсалютна немагчымае вызваленьне Беларусі й адбудова дзяржаўнае незалежнасьці беларускага народу, таксама, як і немагчымае здабыцьцё дзяржаўнае незалежнасьці ўсіх іншых, паняволеных Расеяй народаў.

5. Імкнуцца да супольнага, скаардынаванага і ўзгодненага змаганьня з бальшавіцкім, наагул расейскім і ўсякім іншым імпэрыялізмам у вагульным фроньце паняволеных і пагрожаных ім народаў, здаючы сабе дакладна справу з таго, што толькі такая форма змаганьня здолее гарантаваць ягоную ўдачу й поўную перамогу перад вялікім наступам варожае сілы, а потым — да калектыўнае, на аснове ўзаемных жыцьцёвых інтарэсаў абапёртае канструкцыі такога ўкладу міжнародных сілаў і сувязяў у Эўропе, які-б поўнасьцяй забясьпечыў беларускаму народу ўтрыманьне ягонага сувэрэнітэту перад магчымымі наступнымі спробамі агрэсіі расейскага ці якога-небудзь іншага імпэрыялізму й гарантаваў-бы яму дзяржаўную незалежнасьць, тэрытарыяльную цэласьць і гаспадарскую самавыстачальнасьць.

Падтрымваючы такім парадкам канцэпцыю будучага міжгаспадарстваўскага блёку ці іншых міжгаспадарстваўскіх сувязяў народаў, паняволеных і пагрожаных сяньня бальшавізмам, і вызнаючы, што такі блёк ці іншая міжгаспадарстваўская канструкцыя найлепей гарантуе сувэрэнітэт гэтых народаў перад магчымымі ў будучыні расейскім і нямецкім імпэрыялізмамі ды выдатна спрычыніцца да ўтрыманьня раўнавагі сілаў у Эўропе, адначасна імкнуцца, у выпадку патрэбы да ўваходу Беларусі — у межах гэтага агульнага блёку — у цясьнейшы блёк гаспадарстваў, які быў-бы карысны для эканамічнага, культурнага й палітычнага разьвіцьця гэтых дзяржаваў ды паралізаваў-бы і нэўтралізаваў-бы магчымыя імпэрыялізмы народаў, што былі-б у гэтым агульным блёку. Як адзін із магчымых плянаў такога цясьнейшага, у межах агульнага міжгаспадарстваўскага блёку, мог-бы, прыкладам, быць плян беларуска-балтыцка-скандынаўскага блёку, які найлепш адказваў-бы эканамічным, культурным і палітычным інтарэсам народаў, што ў яго ўваходзілі-б.

7. Беларуская вонкавая палітыка павінна імкнуцца да ўстанаўленьня ў будучыні прыязных і добрасуседзкіх дачыненьняў Беларусі з усімі ейнымі суседзямі, а ў тым ліку і з этнаграфічнай Расеяй.

Рада Беларускае Народнае Рэспублікі спадзяецца, што ўсе народы, паняволеныя сяньня расейска-бальшавіцкім імпэрыялізмам, зь якімі нас лучыць супольная доля няволі, а таксама і ўсе вольныя народы заходняе дэмакратыі поўнасьцяй зразумеюць зусім законныя імкненьні беларускага народу й падтрымаюць яго ў ягоным змаганьні за аднаўленьне незалежнае й дэмакратычнае Беларускае Народнае Рэспублікі.

Рада Беларускае Народнае Рэспублікі.

Ад рэдакцыі. Пастанову ў справе нутраное палітыкі пададзём у наступным нумары нашае газэты.

НАЙВЫШЭЙШЫ КАЗАЦКІ КРУГ

На ўгодкі тысячагодняга гістарычнага існаваньня Казацтва, 19-20 чырвеня сёлета ў Мюнхэне, у залі Нямецкага музэю адбыліся паседжаньні Найвышэйшага Казацкага Кругу (Кангрэсу) замежамі, на якіх былі ўпаўнаважаныя дэлегаты палітычных, грамадзкіх, бытавых, прафэсійных, культурных і рэлігійных арганізацыяў усіх краёў расьсяленьня казацкае эміграцыі.

У залі, дасканальна ўдэкараванай казацкімі нацыянальнымі сьцягамі, гэрбамі, зяленівам, краскамі й мастацкімі транспарантамі, што сымбалізавалі тысячагодзьдзе Казацтва, 19 чырвеня адбылося ўрачыстае адчыненьне Найвышэйшага Казацкага Кругу, на якім былі прадстаўнікі ўсіх народаў цэнтральнае і ўсходняе Эўропы ды падсавацкае Азіі, апрача Расейцаў, прадстаўнікі прэсы й мясцовае казацкае грамадзкасьці.

Паседжаньне Найвышэйшага Казацкага Кругу адчыніў старшыня Казацкага Народнага Прадстаўніцтва інж. В. Глазкоў. Пасьля ягонага кароткага прывітаньня, паводля старадаўнае казацкае традыцыі, адбылося кароткае малебства, а тады сп. Глазкоў сказаў прамову, прысьвечаную тысячагоднаму юбілею Казацтва. Далей выступалі з прывітаньнямі Казаком прадстаўнікі ўсіх прыгнечаных Масквою народаў, выказаўшы свае нязьменныя сымпатыі й прыязьнь да Казакоў, а таксама цьвярдую пэўнасьць у канцавой перамозе ў змаганьні гэтых народаў за сваю Свабоду й Незалежнасьць. Апрача таго, выступалі з прывітаньнямі й прадстаўнікі палітычных і грамадзкіх цэнтральных міжнацыянальных арганізацыяў.

Затым былі абвешчаныя прывітальныя тэлеграмы, прысланыя з усіх канцоў сьвету, і паказаныя колькі тысячаў прывітаньняў і пажаданьняў казацкіх мясцовых арганізацыяў і паасобных Казакоў з усіх краёў, што ляжаць за зялезнай заслонай. Былі ня толькі прывітаньні ад казацкіх арганізацыяў Заходняе Эўропы, але й з Паўдзённае й Паўночнае Амэрыкі, Японіі, Далёкага й Блізкога Ўсходу, Індыі, Аўстраліі, зь берагоў Афрыкі, а таксама й з краёў Скандынаўскага паўабтоку.

Найвышэйшы Казацкі Круг замежамі паслаў аднагалосна прынятую тэлеграму да галоваў усіх гаспадарстваў заходніх дэмакратыяў.

Пасьля ўрачыстага адчыненьня Кругу, дармо, што навакол быў нэрвовы настрой у сувязі з грашовай рэформаю ў Заходняй Нямеччыне, што праходзіла якраз гэтымі днямі, у люстраной залі «Баварскага Двара» адбылася вячэра, на якой былі прадстаўнікі прыязных Казаком народаў, прэсы й дэлегаты Кругу.

20 чырвеня на працоўных паседжаньнях Кругу былі абмеркаваныя пытаньні, зьвязаныя з агульным міжнародным палажэньнем і абумоўленымі ім задачамі казацкае палітычнае эміграцыі, якая пры паняволеным стане казацкага народу становіць выказьніка й прадстаўніка падзеяў ды імкненьняў свайго народу, былі прынятыя адпаведныя пастановы палітычнага й арганізацыйнага характару, а таксама абранае Найвышэйшае Казацкае Прадстаўніцтва й Кіраўніцтва ўсіх Казакоў, што перабываюць вонках свае паняволенае Бацькаўшчыны. За найвышэйшага Атамана (прэзыдэнта) быў абраны былы паходны атаман Вольнага Казацтва І. Білый. За Віцэ-Атамана й кіраўніка казацкага народнага й палітычнага прадстаўніцтва, наўсуперак даўгім адмовам ад свае кандыдатуры, інж. В. Глазкоў. За генэральнага сакратара прадстаўніцтва й кіраўніцтва — рэдактар І. Безуглоў.

Прыняцьцём тэксту звароту Найвышэйшага Казацкага Кругу замежамі да ўсяго казацкага народу, як таго, што стогне пад бальшавіцкім ярмом, так і таго, што перабывае ў расьцярушаньні на далёкай чужыне, адсьпяваньнем казацкага гімну й пажаданьнем удачаў у далейшым змаганьні Казакоў за сваю свабоду й незалежнасьць былі скончаныя працы кругу, скліканага гэтым разам не на сваёй казацкай бацькаўшчыне Казакіі, а на далёкай чужыне.

Ів. Гарбуз.

ГЕНЭРАЛЬНЫ НАСТУП НА БАНДЫТАЎ

Атэны (ДЭНА). Пачаўся генэральны наступ грэцкіх урадавых войскаў супраць базаў «паўстанцаў» у заходняй Македоніі. 6 дывізіяў бяруць удзел у гэтым, дасюль найбольшым прадпрыёмсьцьве грэцкіх урадавых войскаў, мэта якога — канчальнае разьбіцьцё камандаваных «генэралам Маркосам» бандытаў. У апэрацыях бяруць удзел грэцкія паветраныя сілы й морскі флёт. Як падае ІНС, «паўстанцы» ад пачатку першых наступальных апэрацыяў ужо панесьлі страты больш за тысячу чалавекаў. Паводля АФП, «генэрал Маркос» зьвярнуўся да югаслаўскага начальніка гаспадарства маршала Тыто з просьбай аб пільнай вайсковай памозе.

Янка Купала - наш!

У ВЫРАЙ

Гэй, вольныя птахі, саколія дзеці!
У вырай! Да сонца вясёлкавым шляхам!
Час сонца схапіці і сонцам ірдзеці
І зьведаваць сьветы арлiным узмахам.

Гэй, вольныя птахі, патомкі Крывічаў!
Да неба! Па зоры і гром пяруновы...
Час крыльле расправіць—пагудка ўжо кліча,
Ўжо віхры цярэбяць да шчасьця шлях новы.

Гэй, вольныя птахі, уладарнікі песьні!
На шляхі, пад сьцягі красы і свабоды!...
Час вылецець к славе з пагібельнай плесьні
І песьняй агністай дзівіці народы.

1920.

Янка Купала

СУД ГІСТОРЫІ

29 чырвеня сёлета мінае 6 год з дня сьмерці Янкі Купалы (29. 6. 1942). Гаварыць аб тым, хто такі Янка Купала — сяньня бадай ці даводзіцца. Кажнаму нацыянальна-сьведамаму, дый навет нясьведамаму суродзічу добра знанае гэта ймя. Дый чужыя шырака знаюць яго. Імя гэтае моцна зьвязанае зь імём нашае Бацькаўшчыны, і гэтую сувязь ніхто й нішто ды ніколі разарваць ня здолее.

Ня ўсім аднак ведамы факт сьмерці Янкі Купалы, а яшчэ менш ведаюць аб характары гэтае сьмерці — аб тым, што **Янка Купала скончыў сваё жыцьцё самгубствам.** Саветы старанна затойваюць апошні факт, намагаючыся замацаваць за сабою Купалу апошняга дзесяцігодзьдзя — Купалу-аўтара вымушаных ізхным тэрорам одаў «Табе, Правадыр» і падобных рэчаў, мастацкая бязвартаснасьць якіх, што кідаецца ў вочы кажнаму, хто толькі хоць крыху знаецца на паэзіі й знае ранейшага Купалу — была адзіным даступным паэту-вязьню спосабам пратэставаць супраць гвалту над ім з боку «раскованых рабоў». Але затаіць гэтага да канца ім не ўдалося — вестка прасачылася праз усе «зялезныя заслоны» й засланкі. Яна была ўпяршыню пададзеная два гады таму, у вадным з тагачасных лягерных рататарных выданьняў («Ведамкі», Рэгенсбург), узятая з абсалютна пэўнае крыніцы. Невялічкі аднак тыраж гэтага выданьня ня мог шырака разьнесьці тае весткі, і магчыма, што сяньня шмат хто даведаецца ўпяршыню толькі ад нас аб Купалавым самагубсьцьве, а мо навет упяршыню і аб ягонай сьмерці наагул.

Факт Купалавага самагубства мае першараднае значаньне. Ён перачырквае ўвесь той апошні вымушаны савецка-вернападданьніцкі пэрыяд ягоны і варочае нам назад Купалу — нацыянальнага волата й прарока. Ён павінен змусіць кажнага перагледзець борздасьпелыя прысуды, вынесеныя можа ў часіну вялікага болю за Родны Край, болю сэрца, калі не даходзіць да голасу розум і зразуменьне.

Бо вось яшчэ на самым пачатку нашае газэты рэдакцыя атрымала ананімны ліст, які падаецца тут бяз усякіх зьменаў:

Мюнхен, 18. 12. 47.

Паважаныя спадары!

Мы — маладыя Беларусы з Савецкай Беларусі, добра ведаем тамашнюю абстаноўку, вучыліся ў беларускай школе.

Ці можаце вы зразумець наша пачуцьцё, калі мы прачыталі ў першым нумары нашай беларускай газэты «Бацькаўшчына», што тут у эміграцыі ёсьць гімназія, якая носіць імя Янкі Купалы, таго самага, што мае некалькі ордэнаў, штодзень пяе гімны Сталіну, яго бальшавіцкай своры, чырвонай арміі, калгасам, таго самага, чые вершы, як вершы бальшавіцкага пісьменьніка, застаўлялі вучыць нас у савецкай школе.

Нам чытаць гэта было вельмі балюча і сорамна.

Няўжо ў Беларусаў няма паважных людзей, чыё імя магла-б насіць гімназія, у якой навучаюць дзяцей тых, што пакінулі радзіму з-за праклятага бальшавізму, з-за такіх, як Янка Купала, Якуб Колас і другія, ім падобныя; няўжо так абавязкава даваць гімназіі чыё-небудзь імя, нельга абыйсьціся і бяз гэтага? Для нас гэта незразумела.

Акрамя таго, нас цікавіць яшчэ адно: у Савецкім Саюзе ёсьць такі закон: калі даюць якой-небудзь установе, школе альбо інстытуту імя чалавека, які яшчэ жыве, то спачатку павінны спытаць яго дазволу. Колькі мы ведаем — Янка Купала яшчэ жыве. Ці пыталася гімназія яго дазволу і, калі пыталася, то як? Ці не згаварыўся дырэктар гімназіі зь Янкам Купалам яшчэ некалькі гадоў таму назад, альбо пытаўся дазволу зараз у савецкім паўпрэдстве?

Нам, здаецца, што ўсім Беларусам, якія хоць крыху кахаюць сваю Радзіму, якія мараць звярнуцца на сваю бацькаўшчыну, павінна быць балюча і сорамна, сорамна з-за адсутнічаньня крытычных адносін да ўсяго нас акружаючага.

Група маладых Беларусаў.

Розныя пачуцьці можа выклікаць гэты ліст, розныя здогады што да свайго паходжаньня... Але, калі падыйсьці да яго як найаб'ектыўней, паверыўшы ў найбольш чыстую магчымасьць — нельга асуджаць аўтараў (ці можа аўтара пад калектыўным псэўдонімам) за тое, што яны ані ня ведалі аб Купалавай сьмерці (ня кажучы ўжо пра самагубства), ані, жывучы й пакутуючы пад сталінскім тэрорам, прыймалі ўсё за «чыстую манэту» й не маглі разгледзець у паэце такога самага — дый яшчэ куды большага! — пакутніка за Родны Край, ды зачынялі яго ў вадзіныя дужкі «праклятага бальшавізму» — яго, найбольшую ахвяру гэнага праклятзьця...

Суд «маладых Беларусаў» над Купалам — гэта ня суд гісторыі. Але ў ім усё-ж ёсьць частка гэтага суда. Сам паэта прадчуваў добра, што гэткага суда яму ня мінуць. Сам ён першы меў мужнасьць выказаць гэта, выказаць якраз у тым самым часе, калі ўжо рука ягонай змушаная была пісаць «гімны Сталіну, ягонай бальшавіцкай ганьні, чырвонай арміі, калгасам». Мала каму ведамы, і мала хто мо ўчытваўся ў вадзін із паэтавых вершаў апошніх год, які ён уціснуў у вадзін із сваіх апошніх юбілейных зборнікаў, побач із тымі гімнамі й одамі. Дык пададзём яго тут цалком:

І прыдзе новых пакаленьняў
На наша месца грамада
Судзіці суд, ці мы сумленна
Жыцьцё прайшлі, ці чарада

Зьняваг мінулых нас ня зьела,
Пакінуўшы свой дым і чад.
І мы падаўнаму нясьмела
Жылі ня ў лад і неўпапад?

Ці аб свой гонар дбайна дбалі,
І дабравольна, бяз прынук,
Самі сабой не гандлявалі,
Ня несьлі ў петлі дум і рук?

І ці пакінуці на памяць
Мы песьні гэткія змаглі,
Зь якіх-бы можна было ўцяміць,
Што мы свабодными былі?...

А ўжо свой выдасьць непадкупны
Аб нас гісторыя прысуд,
Калі аглядам гляне рупным
І разьбярэ, ў чым справа тут.

У сьветкі запісы пакліча,
Паданьні клікне ў час такі
І ўсё паліча, пераліча...
А суд гісторыі цяжкі...

І засумуецца патомак,
Калі дазнаецца аб нас,
Што нейкі з нас, хоць быў ня зломак,
А плечы гнуў у крук ня раз:

Ня йшоў з адкрытымі вачыма
У сьвет і сьцежкі не прастаў,
А ўсёй магчымасьці магчымай
Таптаў сьляды, сябе таптаў...

Ці патрабуе гэты верш якіх-небудзь камэнтараў? Ці можна было-б вынесьці больш суровы прысуд — куды суравейшы за спопырску нагаворанае «маладымі Беларусамі» — як гэтае самаасуджэньне?

Суд гісторыі, «суд цяжкі» над Янкам Купалам пачаты ім самым, самым-жа выкананы й сьмяротны прысуд. Але апошняе — толькі фізычнаму Купалу. Духовае-ж несьмяротна, «напісанае пяром не высякаецца тапаром». А ў напісаным, перад сілаю духу пачаткаў — «Шляхам Жыцьця», «Спадчыны» асабліва — зыходзяць у глыбокую засень вымучаныя безмастацкія «Рэкі Арэсы» й розныя «Табеправадыры» год нярволі й пакуты. Волат пераважае у крук зыгнутага й зламанага. Не навіна ў гісторыі, што й волаты гнуліся й ламаліся. Добра знаны, пэўна, «маладым Беларусам з Савецкае Беларусі» расейскі Пушкін адрабляў свае оды «Вольность», «Послание декабристам» і інш. вернападданьніцкімі вершамі Міколу I — «Міколу Палкіну». А ці-ж можна раўнацьціск таго «Палкіна» да сучаснага «сталёвага» сталінскага ціску?

Запраўды, трэба ставіцца да ўсяго крытычна. Але разам із тым і ўсебакова, і аб'ектыўна. Трэба ўмець ненавідзець — але ніколі не ахвяру, а ката! — трэба ўмець і разумець і выбачаць ды дароўваць.

А на ўсім гэтым і выснуе гісторыя свой «непадкупны прысуд» і Янку Купалу, і кажнаму, хто заслужыцца на ўваход у гэтую гісторыю. «Наша вярнуцца нам мусіць канечна», як казаў сам Купала. І наш Купала — Купала—нацыянальны трыбун і прарок, Купала — волат духу й мастацтва — ужо зьвярнуўся да нас, запраўды «сьмерцяю сьмерць перамогшы».

І з намі будзе заўсёды.

І. Спадзявайла.

АЛЕСЬ САЛАВЕЙ
ОРДЭНАНОСЦАМ

Вам прышпілілі ордэн той-жа самы:
пышлівы гонар адмысловым катам.
Нясе нядрэмнасьць варту вашым хатам,
для сьмерцяў новых выкапаўшы ямы.

На ўяўнай цноце нат ня змыты плямы
крыві, пралітай закатаваным братам.
Ну што-ж, тварэце неўгамонным сьвятам
і т а т у — б а ц ь к у гучныя рэклямы.

Рука у путах — «Слава!» — піша — «Слава!» —
А розум цьвердзіць: «Згінь, прысуд крывавы!» —
Не, гэна бляшка таннае мэдалі

душы ня сьмеціць, з думкай не начуе,
і вусны шэпчуць — толькі Бог вас чуе —
малітваў словы — іх вы не прадалі.

1948.

ЯНКА КУПАЛА
АКОЎ ПАЛОМАНЫХ ЖАНДАР...

Акоў паломаных жандар,
Сьліўнём зарыўшыся ў нару,
Сядзіць расейскі чынадрал,
«Слуга оцечаству, цару».

Ён сьніць былую моц і шыр:
Цары, царыцы, цэрквы, трон,
Пагромы, катаргі, Сібір...
О, Русь! Прыймі раба паклон!

Табе такой служыць па гроб
Ня кіну я, і расьцярзаць
Ня дам дзяржаўнасьці «оплот»,
Цябе, «единую», о, маць!

Здарма-ж двуглавы твой арол
Праз векі ў кіпцюрох трымаў
Мільёны ўбогіх хат і сёл,
Рабоў мільёны?... Нездарма!

У твой ланцуг былі, о, Русь,
Уплецены з усіх бакоў
Украйна, Польшча, Беларусь
І сотня іншых «языкоў».

Цяпер, што бачу я кругом?
Пасад маўклівы збуран скрозь...
Рэспублікі? Ды зь «языком»
Зь іх лезе кажная ўсур'ёз.

А ты, о рускі мой «язык»!
Мой «общчарускі», што з табой?
Табе слухмян быў мал, вялік,
Быў слаўен ты сваёй кляцьбой.

Табой сам самадзержац цар
Пісаў ланцужны свой закон,
Што маці-Русь есі жандар
Усёй Эўропы...
І свой сон

Сьніць далей гэты царадвор,
Калі надыйдзе яму дзень,
Ізноў пад лёзгат царскіх шпор
Свой распасьцерці чорны цень.

Ён, гэты скінуты сатрап,
Ня знае, што ў свабодзе жыць;
Яму дай вісельню, дый каб
На ёй «языкі» ўсе ўшчаміць.

Не па нутру, як сьмерць, яму,
Што беларускае дзіцё
Бяжыць у сьцюжную зіму
У школку пазнаваць жыцьцё.

Спужаўся, што хлапчо ў лапцёх,
Напоўадзеты вёскі сын,
У роднай мове ўчыцца змог?...
О, стыдна, рускі «гражданин»,

Язык твой царскі ён табе
Ня выража, спакойны будзь.
Цябе тваім-жа у кляцьбе
Ён не забудзе памянуць.

Былых ня выклічаш вякоў
І ты, Масквы каронны гразь,
Парваных ня скуеш акоў,
Зь якой брахнёю ня вылазь!

1926.

ПЕСЬНЯ СОНЦУ

Вольным гоманам хвоек высокіх,
Туманамі санлівых нізін,
Казкай векаў блізкіх і далёкіх
Клічам, сонца, цябе, як адзін.

Распусьці залацістыя косы,
Схаладзелы загон ацяплі,
Аквяці лугавыя пакосы,
Ўсходы новыя сей на зямлі.

Зь непатульнай, пакорнай зямліцай
Заручыся, шлюб вечны вазьмі,
Разьлівайся люстранай крыніцай
Між даламі, гарамі, людзьмі...

Рассыпайся па сёлах, па нівах
Брылянцістай ажыўчай расой,
У вясёлках купайся цьвятлівых,
Ласкай сэрца, душу супакой...

Як у сьвята купальскае, сонца,
Свой жывы абнаўляеш паглёд,
Аднаві славу нашай старонцы,
Аднаві яе сумны народ!

Хай нам явары вечныя думы,
Думы-байкі шасьцяць, шалясьцяць
І нясуцца хай гэтыя шумы,
Па бел-сьвету ляцяць, хай ляцяць...

Дык глянь з хорамаў вольных, высокіх
Да крывіцкіх туманных нізін.
Казкай векаў блізкіх і далёкіх
Клічам, сонца, цябе, як адзін!

1913.

Па кутках эміграцыі

ПРЭЗЫДЭНТ СЯРОД НАШЫХ ЖАНЧЫНАЎ

25 чырвеня на сяброўскай гарбатцы Беларускага Жаноцкага Згуртаваньня ў Остэргофэне быў сп. Прэзыдэнт БНР інж. М. Абрамчык. У прыгожа прыбранай нацыянальнымі тканінамі залі правялі мы із сп. Прэзыдэнтам пару гадзінаў супольнае гутаркі, гадзінаў, якія застануцца ў нашай памяці на даўгі час.

Мы зразумелі, што каб пазнаць бліжэй нашага Прэзыдэнта, усю крыштальную чысьціню ягонае нацыянальнае думкі, любасьць да Бацькаўшчыны і ўсяго роднага, трэба яго чуць, трэба бачыць яго зблізку, трэба быць зь ім разам хоць гэткі час, як гэта было ў нас на нашым вечары.

Ад імя Жаноцкага Згуртаваньня ў Остэргофэне прывітала сп. Прэзыдэнта старшыня Згуртаваньня сп. Ст. З., у кароткай прамове падзякаваўшы сп. Прэзыдэнту за прыбыцьцё на вечар нашае арганізацыі, якая, хоць яшчэ й зусім маладая, але стаўляе пэўна першыя крокі на грамадзкім груньце. «Палітыку й дыплёматыю, — сказала сяброўска старшыня, — мы пакідаем сваім мужом. У нас палітыка адна, вельмі простая, — гэта вольная й незалежная Беларуская Народная Рэспубліка. Гэта наш ідэал, да якога мы, побач із мужчынамі, будзем усімі сіламі ймкнуцца. У змаганьні за гэты ідэал павядзём і сваіх дзяцей, дачок і сыноў, якія падмацуюць і папоўняць рады змагароў. Мы верым, што вернемся дамоў і будзем сьветкамі найвялікшага нашага сьвята, трыумфу нашае нацыянальна-вызвольнае думкі — устанаўленьня незалежнасьці нашае Бацькаўшчыны, на чале якой — мы пэўныя ў гэтым — будзеце стаяць Вы, наш дарагі Прэзыдэньце».

Сп. Прэзыдэнт адказаў на гэтыя словы даўжэйшай прамовай. Між іншага, ён сказаў: «Мне цяжка гаварыць, другі раз я чуюся тут у Вас, у Остэргофэне, моцна ўсхваляваным. Першы раз — гэта на зладжаным Вамі сьвяце Маці. Я апавядаў аб гэным сьвяце нашым суродзічам у Парыжы, апавядў, зь якім захапленьнем малыя двох- і трохгадовыя дзеткі сьпявалі патрыятычныя песьні, трымаючы ў руках вялікія букеты красак — падарункі сваім маткам. Гэта зрабіла на мяне тады вялікае ўражаньне.

А цяпер я другі раз вось тут, між Вас.

Я хачу Вам сказаць, што ня трэба зьнеахвочвацца тым, што Вашая арганізацыя маладая, таксама не павінна быць за перашкоду ў працы невялікая колькасьць сяброў. Малая група людзей, сьведамая свае мэты, можа зрабіць вельмі шмат».

У далейшым сп. Прэзыдэнт выказаў думку, што жанчыны маюць роўныя правы з мужчынамі браць удзел у грамадзкім і палітычным жыцьці гаспадарства, што яны маральна больш адпорныя на ўсякія адмоўныя сацыяльныя звычкі, пры гэтым выяўляюць у працы больш зразуменьня й сэрца.

«Перад Вашай арганізацыяй стаяць вялікія заданьні, — сказаў сп. Прэзыдэнт. — Вам трэба наладзіць лучнасьць з жаноцкімі арганізацыямі іншых нацыянальнасьцяў у Нямеччыне й іншых краёх ,прыкладам, у Францыі. Прадстаўнічкі ад беларускіх жанчынаў уваходзяць у Міжнародную Жаноцкую Лігу, на апошнім кангрэсе якой у Парыжы здабылі яны поўную й шчырую сымпатыю ды спачуваньне жанчынаў усяго сьвету...».

На гэтым скончыў сваю прамову сп. Прэзыдэнт, але гаварыў з намі і далей, гаварыў шмат, расказваў, пытаўся й адказваў, і шмат здаровых, ясных думак запала ў нашыя душы ў часе гэтае гутаркі.

Усё прыгожае мае свой канец — і скончыўся наш слаўны сяброўскі вечар, заціхлі адвечна-старыя мэлёдыі нашых народных песьняў. Павандравалі ў куфэркі прыгожа вышываныя сарочкі, хвартухі ды саматканыя спадніцы нашых сябровак з Палесься да наступнога разу, наступнога сьвята... А мы пачуліся нейкімі мацнейшымі й лепшымі ды зь яшчэ большай ахвотай бяромся за далейшую сваю працу ў Згуртаваньні.

Сяброўка.

ЗАКАНЧЭНЬНЕ ШКОЛЬНАГА 1947-48 г. У ПАЧАТКАВАЙ ШКОЛЕ ВІНДЫШБЭРГЕРДОРФУ

Пачаткавая школа ў Віндышбэргердорфе 18. 6. закончыла свае заняткі перад летнім перапынкам. Другагоднікаў блізу ніводнага, апрача пары вучняў, якія прыйшлі ў школу апошнімі месяцамі навукі.

21 чырвеня настаўнікі школы Л. Альшэўская й А. Асіпчык ўрачыста адзначылі ўзнагародамі выдатнікаў і раздалі пасьветчаньні пераводу ў наступныя клясы. Уся дзіцячая цікавасьць сканцэнтравалася на тых вучнях, якія выклікаліся й атрымвалі пасьветчаньне абсалютных выдатнікаў з дадаткам узнагароды ў форме кніжак, паштовак з партрэтамі нашых нацыянальных паэтаў ці якіх іншых школьных прыладаў. Гэта былі вучні: Савук Вячаслаў, Мільляновіч Васіль, Нафрановіч Росьцік (IV кл.), Лук'яновіч Ганна, Грынко Тамара, Нафрановіч Марыя, Ракуць Мікалай (III кл.), Грынко Дуня, Салівончык Ліда, Вышынскі Віця, Бабей Люба, Хадановіч Лёня, Мірановіч Міхась, Русак Вера (II кл.), Бабей Валодзя, Івашка Косьцік, Мірановія Ліда, Лашук Нікодым, Мельнік Маня (I кл.).

Трэба сказаць, што школа ў Віндышбэргердорфе працавала шмат і спорна, асабліва бяручы на ўвагу, што гэта быў першы год навукі ў сваёй нацыянальнай школе па вылучэньні з польскіх ці ўкраінскіх лягераў. Каму давядзецца быць у лягеры Віндышбэргердорфе й спаткацца зь дзецьмі, той даведаецца, што яны шмат ведаюць усяго таго, што трэба, каб ведаў беларускі вучань. Трэба падчыркнуць тут родную песьню, якой з асаблівай стараннасьцяй настаўнікі навучалі дзяцей, і школьнікі могуць пахваліцца, што ведаюць каля сотні песьняў. А гэта-ж наш скарб на чужыне. Таксама й нашая паэзія патрыятычнага зьместу. Школа навучыла дзяцей каля 300 вершаў, а мо й больш, якія дэклямаваліся на сцэне й гэтым узгадоўвалі й старэйшае пакаленьне нашых суродзічаў, якім не стае кніжкі, а некаторыя зь іх, нажаль, і зусім няпісьменныя.

Таму й 21 чырвеня, пры сьвяточным настроі гадовага сьвята Сёмухі, калі вучні выступалі на сцэне із сваймі дэклямацыямі й сьпевамі (35 розных вершаў і 8 песьняў), бацькі й жыхары лягеру, прыслухоўваючыся словам вершаў і песьняў, бурнымі воплескамі выказвалі сваё задаваленьне. Добра хтось сказаў, што моладзь — гэта нашая радасьць, нашая будучыня. Ад сябе дададзём адно: «Моладзь — гэта нашая праца».

Настаўнік **А. Асіпчык.**

ВЫСТАЎКА Ў БАЙРОЙЦЕ

Дзякуючы вялікім стараньням дырэктара ПК ІРО Арэа 3 Байройт, сп. Лісяка, у Байройце ў часе ад 5 да 12 чырвеня сёлета была наладжаная міжнацыянальная выстаўка працаў ДП, што пражываюць у гэтай Арэа.

Выстаўка была папярэджаная канцэртам, наладжаным аматарскімі й прафэсіянальнымі сіламі ДП. Канцэрт прайшоў вельмі ўдала. Беларуская аматарская трупа зь лягеру Майнлёйс дала нашыя народныя танцы «Лявоніху» й «Бульбу».

На выстаўцы беларускі аддзел рэпрэзэнтавала сваймі вырабамі ведамая ў лягерах ДП і за лягерамі мастацкая майстроўня касэтак «Раніца». Сваймі арыгінальнымі, характэрнымі беларускаму мастацтву багатымі народнымі арнамэнтамі, мазаічнымі вырабамі з саломы па дрэву гэтая галіна мастацтва сьцягвала да сябе шмат зацікаўленых наведвальнікаў. Прыгожыя касэты, альбомы, пісьмовыя прылады, табакеркі песьцілі вока зьбіральніка мастацкіх вырабаў.

Вялікую ўвагу выклікала разьба па дрэву ведамага яшчэ на Бацькаўшчыне майстры разьбяра Якуба Кузьміцкага. Майстар Міхал Крупка выставіў ведамыя сваім прыгаством папяросьнікі. Але найбольш мо за ўсё прыцягвала да сябе наведвальнікаў стаянка ткацкага аддзелу. Тут былі выстаўленыя ў мініятуры ўсе прылады, ужываныя ў працэсе вырабу тканінаў на Беларусі, як мяліца, трапло, зграбёлка, калаўрот, вітушка, сноўкі, сукала з камплектам цэвак і кросны з затканым із запраўдных нітак палатном. Палотны, ручнікі, абрусы, посьцілкі, паясы й гальштукі, што захаваліся йшчэ з Бацькаўшчыны, дапаўнялі стаянку, над якой угары горда лунала Пагоня.

У выстаўцы бралі ўдзел Жыды, Палякі, Украінцы, Летувісы, Латышы, Эстонцы й Расейцы. Зацікаўленьне выстаўкай было нагэтулькі вялікае, што кіраўніцтва было змушанае працягнуць выстаўку на два дні. Вялікую рэкляму для выстаўкі зрабілі адпаведна на гэта выданыя ілюстраваныя каталёгі.

Так арганізаваныя выстаўкі варта было-б зрабіць у кажнай Арэа.

М. В.

АД ПРАВАСЛАЎНЫХ БЕЛАРУСАЎ ЛЯГЕРУ ВІНДЫШБЭРГЕРДОРФ

Даведаўшыся з газэты «Бацькаўшчына», што праваслаўныя Беларусы, зьехаўшыся ў францускай зоне Нямеччыны ў горадзе Канстанцы 5. 6. 48 г. супольна із сваім беларускім праваслаўным духавенствам пад апекай Уладыкі Сергія стварылі часовы камітэт для праводжаньня працы ў кірунку да поўнае Аўтакефаліі Беларускае Праваслаўнае Царквы, шчыра й з энтузіязмам прынялі мы гэтую вестку й перасылаем сваім сьвятаром-патрыётам у францускай зоне шчырае прывітаньне, дакляруючы ў кажным часе сваё падтрыманьне.

Дай Вам Божа плоднае працы на Ніве Божае Справы — збаўленьня душаў нашых суродзічаў ад спакусы маскоўскага сільля, што расстаўленае, дзе ні ступні, ад душахвацтва, а мы сваймі малітвамі перад Воблікам Цудатворнага Абраза Жыровіцкае Божае Маці ў сваёй царкве будзем прасіць і маліць аб Пакроў для нашае Аўтакефальнае Царквы на чужыне.

Перасылаем шчырую ўдзячнасьць Найасьвяшчэнейшаму Ўладыку, епіскапу Сергію за ягоную сьвятую апеку над намі, сіротамі, пакінутымі на чужыне. Навязваючы праз яго малітоўную лучнасьць з Украінскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквой, складаем таксама прывітаньне Галаве Ўкраінскае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы — Уладыку Мітрапаліту Палікарпу.

З новай сілай, з насланьнем Сьвятога Духа дзеля збаўленьня душаў нашых у службе Богу й Народу, Багаславі, Божа, парастак Царквы нашае ў вадзінсьцьве Сьвятое Ўселенскае Саборнае Праваслаўнае Веры!

Глыбоцкі.

Рэдакцыя просіць добразычлівых чытачоў памагчы ёй у сучасных фінансавых цяжкасьцях хоць-бы прысыланьнем падпіскі ў новых грошах (калі падпіска аплачаная ў старых грошах — яна будзе залічаная наперад).

Апошнімі часінамі складаньня гэтага нумару нашае газэты надыйшла сумная вестка аб раптоўнай сьмерці настаўніка гімназіі імя Янкі Купала ў Міхельсдорфе — шчырага сына Бацькаўшчыны — сябры АЛЯКСАНДРА АКАНОВІЧА. Ня маючы магчымасьці адгукнуцца шырэй у гэтым-жа нумары зьмяшчэньнем нэкралёгу аб нябожчыку й спачуваньняў з боку розных інстытуцыяў, арганізацыяў і асобаў ды вымушана адкладаючы гэта да нумару наступнага — рэдакцыя выказвае на гэтым месцы свой глыбокі жаль і шчырае спачуваньне асірацелай сям'і... РЭДАКЦЫЯ.

СУПРАЦЬ ЧОРНАЕ СОТНІ

РЭЗАЛЮЦЫЯ

першага Зьезду дэлегатаў аддзелаў і групаў Згуртаваньня Беларусаў Вялікабрытаніі акругі Ковэнтры.

Першы Зьезд дэлегатаў аддзелаў і групаў ЗБВБ акругі Ковэнтры, разгледзеўшы справу паганьбеньня скаўцкіх сьцягоў у лягеры Міхельсдорф, пастанавіў:

1. Лічыць варожай дзейнасьць адміністрацыі лягеру Міхельсдорф, якая 6. 5. 1948 г. у дзень Сьв. Юр'я — Міжнароднага Патрона Скаўтынгу — зрабіла нячуваны дзікі пагром на беларускіх скаўтаў у Міхельсдорфе, зырваўшы й патаптаўшы нагамі ў царкве скаўцкія сьцягі;

2. дамагацца суровага грамадзкага суду над гэтымі бруднымі злачынцамі — падбухторшчыкамі й выканаўцамі нячуванага дзікунства.

За Зьезд падпісалі:
(—) **В. Шчэцька,** старшыня.
(—) **Л. Карась,** сакратар.

КАМ—БЭРХТЭСГАДЭН СКАЎЦКІМ МАРШАМ

Група нашых скаўтаў вырушыла ў пешы паход з Каму на Бэрхтэсгадэн. Выхад адбыўся 28. 6. 48 з Каму. 29 6. скаўты прыйшлі ў Остэргофэн. Тут да іх мае далучыцца яшчэ колькі скаўтаў. Увесь паход (каля 450 км.) мае трываць каля двох тыдняў. Трэба зазначыць, што скаўты ДП паходаў на гэткую воддаль яшчэ не рабілі. Паход разьлічаны галоўна на старэйшых скаўтаў. У паходзе практычна будзе праведзена занясеньне мясцовасьці Остэргофэн—Розэнгайм на карту і, апрача гэтага, падрыхтаваньне да лягернага жыцьця ў летнім сэзоне 1948 г. Маршрут: Кам-Дэгендорф-Остэргофэн-Ляндаў-Розэнгайм-Гімзэе-Бэрхтэсгадэн.

Настрой у падарожнікаў выдатны. Пажадаем ім шчасьлівага падарожжа.

Віт.

АД РЭДАКЦЫІ

У папярэднім нумары нашае газэты, дзякуючы ненармальным абставінам ягонага выхаду, ня была зробленая апошняя карэкта, дзеля чаго ў бальшыні тыражу прайшлі некаторыя памылкі друку, перастаўленыя й прапушчаныя радкі й пад. дэфэкты. Просячы выбачэньня ў паважаных чытачоў за гэтыя прыкрыя для нас рэчы, Рэдакцыя ўважае за канечнае направіць найважнейшыя зь іх:

1) У разьдзеле «Апошнім часам» (1-я бал.) першы сказ мусіць чытацца гэтак: «Ад 28. 7. пачынаецца перавожаньне ДП караблямі з Брэмэну».

2) У зацемцы «Эміграцыя ў Аўстралію» (2-я бал.) апошні сказ мусіць чытацца гэтак: «Эмігранты мусяць заявіць аб згодзе пражыць адзін год на месцы, што будзе вызначанае ім пры эміграцыі, як месца занятку».

3) Дзеля таго, што ў табліцы вынікаў «выбараў» у г. зв. «Беларускую Цэнтральную Адміністрацыю» (зацемка «Ці былі гэта выбары» ў разьдзеле «Па кутках эміграцыі», бал. 4) некаторыя радкі выпалі, некаторыя іншыя былі перастаўленыя, а табліца гэтая мае вялікае значаньне, як афіцыйны дакумэнт аб «выбарах», даводжаны да ведама розных небеларускіх установаў, але старэнна затойваны ад самых выбаршчыкаў навет і ад шырэйшае нацыянальнае грамадзкасьці наагул, Рэдакцыя ўважае за патрэбнае падаць гэтую табліцу яшчэ раз, направіўшы дапушчаныя тэхнічныя дэфэкты друку:

I	II	III	IV	V
Міхельсдорф Ліста № 2	508	320	192	Др. Шчорс М., Ігнатовіч М.,
Майнц-Кастэль Ліста № 2	53	36	36	Вайцяхоўскі К., Карповіч М., Шыбут Ф., Розмысл С. Заступнікі: Дашкевіч С., Стоцька В., Герамімовіч М., Касавец.
Эльванген Ліста № 5	105	60	60	Крыстовіч Барыс
Ліста № 5	39	29	29	Сабалеўскі Юры
Рэгенсбург Ліста № 4	85	52	33	Русак А., Лазарэвіч В.
Мюнхен Ліста № 8	260	151	81	Найдзюк Ч., Родзевіч У., Галубовіч Л.
Тырсгайм Ліста № 9	68	35	35	Лапіцкі Мікалай. Заступнікі: Жарскі, Лічко.
Эшэнляйс Ліста № 9	138	116	106	Ясюк Эмануіл
Гарміш-Партэнкірхэн Ліста № 10	169	121	121	Кіпель Яўхім, праф. Сьцяпанаў Мікалай
Графэншаў Ліста № 11	140	104	102	Жамойда Сымон
Мітэнвальд	230	125	93	Прускі Юры, Малашчык, Шаўцоў
Віндышбэргердорф	423	275	146	Кудрук Я., Курыловіч, Сялівончык
Майнлёйс	353	220	220	Рагуля Васіль, Любачка І., Пауза А., Чарэўка
Натэнбэрг	145	80	68	Лякэ Ільля- Ушаль Анатоль

(Калёнкі абазначаюць: I — лягер, II — лік усіх жыхароў, III — лік жыхароў з правам голасу, IV — лік жыхароў, што галасавалі, V — прозьвішчы выбраных).

Whiteruthenian Weekly „The Fatherland“
Authorized by EUCOM Hg. Civil Affairs Division, 11 March 48, N UNDP 225. Circulation 4000 copies.
Administration — (13b) Osterhofen, Ndby., Whiteruthenian D. P. Camp.
Printed by: Hils & Maier, Dingolfing, Bruckstraße 99.